# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, КНІГАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

УДК 002.2-05(091)(476)

*Л. І. ДОЎНАР*

## БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА ПРА КНІГУ Ў КАНТЭКСЦЕ ПЕРСАНАЛЬНАГА КНІГАЗНАЎСТВА

*Закранаюцца пытанні ўзнікнення і развіцця беларускай навукі пра кнігу ў кантэксце персанальнага кнігазнаўства. Тлумачацца сутнасць і значэнне паняцця «персанальнае» ў кнігазнаўстве, паказваецца роля тых ці іншых асоб у развіцці беларускай навукі пра кнігу на розных гістарычных этапах: ад Сярэднявечча да нашага часу. Адзначаецца роля ў развіцці беларускага кнігазнаўства міжнародных сувязей і персанальных кантактаў: у галіне вывучэння кніжнай спадчыны, удзелу ў міжнародных праектах і канферэнцыях, публікацыі навуковых работ.*

*Сцвярджаецца, што статус навукі пра кнігу ў значнай ступені вызначае статус персанальны – навуковы аўтарытэт той ці іншай персоны, а развіццё навукі ажыццяўляецца дзякуючы не толькі і не столькі суме назапашаных ведаў, а выключна дзякуючы з'яўленню фундаментальных праграмных прац, якія абумоўліваюць рух навукі, яе алгарытм на перспектыву.*

З зараджэннем пісьменства значная ўвага надавалася персонам: дзеячам свайго часу (напрыклад, у летапісах, агіяграфіі (жыціях), мастацкай літаратуры). Пазней прадметам вывучэння сталі знакамітыя людзі мінулых эпох, якія адыгралі прыкметную ролю ў навуцы, культуры і мастацтве. Канец другога тысячагоддзя быў названы часам трыумфу асобы, фарміравання персонасферы як нацыянальнай, так і асобнага чалавека, сацыяльнай групы, чалавецтва [5], што знайшло адлюстраванне ў разнастайных біяграфічных публікацыях перш за ўсё даведачнага характару (ад лакальных да міжнародных, тыпу *Who's who*) [27], а таксама ў шырокім коле літаратуры, прысвечанай біяграфіцы [3], у якой выдзяляюцца разнастайныя групы даследаванняў: культуралагічныя, гістарычныя, філасофскія, літаратурныя, псіхалагічныя [18].

Сёння актуальнай становіцца праблема кнігазнаўчага вывучэння ў комплексе і асобна кожнага элемента персонасферы ў той ці іншай галіне навукі як першаасновы і перспектывы яе развіцця, вызначаючы новыя задачы і неабходнасць сінтэзавання тэарэтычных кнігазнаўчых падстаў. Правамерна казаць пра існаванне галіны персаніфікаваных ведаў, што фарміруецца як інстытутамі, так і персонамі, сярод якіх адно з асноўных месцаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

займаюць пытанні распрацоўкі крытэрыяў і прыёмаў змястоўнага аналізу традыцыйных крыніц інфармацыі аб персонах, методыка персанальнага бібліяграфавання, стварэнне аўтарытэтных запісаў у базах даных, прадастаўленне доступу да персанальных старонак і рэсурсаў, праблемы даследавання персанальных дакументаў, персанальных электронных выданняў[1].

У сучаснай навуцы пра кнігу персанальны кірунак у параўнанні з галіновым ці функцыянальным кнігазнаўствам з'яўляецца, на першы погляд, менш забяспечаным, калі мець на ўвазе тэорыю і метадалогію, аднак як навуковая з'ява – існуе з самага зараджэння навукі пра кнігу і з'яўляецца яе найважнейшай складовай часткай – біяграфічнай. Даследаванню ролі асобы ў развіцці практыкі кніжнай справы і навукі пра кнігу прысвечаны шэраг навуковых прац[2], даведачныя выданні[3], міжнародныя і рэгіянальныя навуковыя чытанні і канферэнцыі[4], біябібліяграфічныя дапаможнікі[5], фарміруюцца спецыяльныя навуковыя галіны (напрыклад, у Германіі – тыпалогія біяграфічных выданняў [27], у Польшчы – біяграфія як навуковая катэгорыя ў бібліялогіі [25], у Расіі – біяграфіка ў кніжнай культуры [4]).

Выданне і перавыданне (пераклады) работ кнігазнаўцаў (у іх ліку каментарыі, рэцэнзіі на працы) таксама з'яўляюцца неадменным паказчыкам развіцця як навукі пра кнігу, так і персанальнага кнігазнаўства ў прыватнасці. Дзякуючы гэтаму кірунку адбываецца адкрыццё і новае прачытанне даўніх аўтараў, вяртанне іх тэкстаў у навуковы ўжытак, а значыць, паступальны рост самасвядомасці дысцыпліны [17].

---

[1] Напрыклад: *Диковская Е. А.* Персональные электронные издания : науч.-метод. пособие. М., 2006. 152 с. (Сер. «Библиотекарь и время. XXI век», № 33).

[2] Напрыклад, серыя «Деятели книги». Гл.: *Григорьев Ю. В.* Серийное издание «Деятели книги» // Книга. Исследования и материалы. М., 1962. Сб. 6. С. 37–51. А таксама – фэстшрыфты, гл., напрыклад: Książka zawsze obecna. Prace ofiarowane Profesorowi Krzysztofowi Migoniowi / komitet red.: Barbara Bieńkowska ; rec. Barbara Bieńkowska. Wrocław, 2010. 492 s.

[3] Напрыклад, «Słownik pracowników książki polskiej» (Варшава-Лодзь, 1972–2010), «Словарь книжников и книжности Древней Руси» : у 5 ч. Л. ; СПб., 1988–1998.

[4] Напрыклад, у Расіі – Фёдоровские, Румянцевские, Смирдинские, Павленковские, Лупповские, Сикорские і іншыя чытанні. Гл.: *Васильев В. И., Самарин А. Ю.* Научные форумы книговедов как фактор развития научных связей и книгоиздания на постсоветском пространстве // Научная книга. 2007. № 1. С. 218–220.

[5] Напрыклад: *Иосиф Евсеевич Баренбаум* : библиогр. указатель: 1950–1980 гг. / сост. М. Бубыр ; Таллин. пед. ин-т им. Э. Вильде. Таллинн, 1981. – 24 с. : ил. ; *Иосиф Евсеевич Баренбаум* : библиогр. указатель / сост. Курбангалеева Талия Сафаргалеевна. Казань : [Б. и.], 1988. 24 с. ; *Инга Александровна Шомракова* : [историк книги, книговед] : аннотир. библиогр. указатель / Санкт-Петерб. гос. ин-т культуры ; науч. ред. И. Е. Баренбаум. СПб., 1992. 31 с. ; *Профессор Кшиштоф Мигонь* : библиогр. указатель / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина ; сост.: Ю. А. Лабынцев, Т. И. Рощина ; предисл. В. А. Петрицкого. Минск, 1990. 48 с. (Крупнейшие книговеды мира : сер. библиогр. указателей) ; *Krzysztof Migoń* : bibliografia publikacji bibliologicznych, 1960–1999 / oprac. Danuta Wańka ; układ typograf. Krzysztof Walczak. – Kalisz, 2000. 61 c. (Sześćdziesiąte wydawnictwo Kaliskiego Towarzystwa Przyjaciół Nauk) ; *Кшыштаф Міганъ = Krzysztof Migoń* : біябібліягр. паказальнік (1960–2010) : да 70-годдзя з дня нараджэння і 50-годдзя навуковай дзейнасці / склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. Мінск, 2011. 210 с. : фат.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, на наш погляд, прадметнай галіной персанальнага кнігазнаўства выступаюць:

1) непасрэдна персона (асоба),

2) інтэрпрэтацыя персанальнай спадчыны, яе развіццё.

Тыпалагічнымі прыкметамі з'яўляюцца: у першым выпадку – *персанальнае тварэнне:* працы кнігазнаўцаў, вынікі дзейнасці (у тым ліку эгадакументы); у другім – *персанальны змест:* выданне прац па даследаванні персоны і персанальнай спадчыны, прысвячэнні персонам.

Неабходна адзначыць, што любыя веды маюць персаніфікаванае паходжанне. Аднак пры трансляцыі і інтэрпрэтацыі гэтых ведаў не заўсёды захоўваецца і вызначаецца іх персанальнае аўтарства. Часам гэта звязана з пэўнымі і спецыфічнымі ўмовамі эпохі, пануючай грамадскай свядомасцю і г.д. Кожная навука мае свае вытокі і сваіх «герояў» і імкнецца гэта выявіць, абазначыць, прасачыць генезіс персаніфікаваных ведаў у сваёй галіне. Не заўсёды проста прайсці гэтым шляхам і адказаць на пастаўленае пытанне адназначна.

Зараджэнне кнігазнаўчых ведаў у Беларусі, цесна звязанае з развіццём пісьменства, распаўсюджаннем і стварэннем рукапісных кніг, адносіцца да IX–XIII стст., калі пра персаніфікацыю ведаў гаварыць цяжка, любыя веды мелі Боскую прыроду, чалавек жа выступаў у ролі рэтранслятара, пасрэдніка. Тым не менш спадчына такіх сярэдневяковых асветнікаў Беларусі, як Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўрамій Смаленскі, што дайшла да нашага часу ў пропаведзях (казаннях), словах, павучаннях, жыціях, дзе абгрунтоўваецца Боская мудрасць, гуманістычная роля і значэнне кнігі, можа паслужыць пэўнай першаасновой, якая ўяўляла хутчэй матэрыялізаваныя Боскія веды [7].

«Гісторыю вызначаюць ня толькі відавочныя, убачаныя і названыя ўчынкі, але й зусім нябачныя, безаблічныя, ананімныя плыні ўчалавечанага часу. Колішнія нерэалізаваныя магчымасьці не здымаюцца назусім: акумулюючыся, яны ўтвараюць своеасаблівую "мінулую будучыню"» [19]. І гэта «мінулае будучае» складаюць таксама створаныя ў XIV–XVIII стст. помнікі пісьменства, у іх ліку вопісы, інвентары, каталогі царкоўных, манастырскіх і прыватных бібліятэк, за якімі стаяць дзясяткі вядомых і невядомых імён дзеячаў кніжнай справы (пісцоў, манахаў, перакладчыкаў, аўтараў, уладальнікаў), што можа служыць прыкладам адносна персаніфікаваных кнігазнаўчых ведаў.

Эпоха Адраджэння для Беларусі – гэта эпоха ўзнікнення і распаўсюджання кнігі друкаванай і «слова друкаванага» пра кнігу, кніжныя веды. Плеяду вядомых гуманістаў-кніжнікаў, гэта значыць персон, вызначаюць Францыск Скарына, Сымон Будны, Мацвей Кавячынскі, Лаўрэнцій Крышкоўскі, Васіль Цяпінскі, Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец, Грыгорый Хадкевіч, Канстанцін Астрожскі, Мамонічы, Іаіль Труцэвіч і інш. Кніга становіцца не толькі духоўным настаўнікам чалавека: «Да совершенен будет человек…» [11, с. 23], але і адлюстроўвае маральна-этычную, ідэйную праграму аўтара, выдаўца, мецэната [10], што пацвярджаюць прадмовы, пасляслоўі, каментарыі, прысвячэнні, размешчаныя ў выданнях XVI–XVIII стст.

У канцы XVII і асабліва ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. развіццё кнігазнаўчых ведаў у Беларусі знаходзіцца пад уплывам асветніцка-дэмакра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тычных гуманістычных поглядаў прагрэсіўных дзеячаў эпохі Асветніцтва. Сярод іх Казімір Лышчынскі, Сімяон Полацкі, Ілья Капіевіч, Бенядзікт Дабшэвіч, Георгій Каніскі, Казімір Нарбут, Міхал Пачобут-Адляніцкі, Іаахім Храптовіч, Ігнацій Быкоўскі, Якуб Ясінскі, Ян Снядэцкі, Міхаіл Бароўскі, Ігнацій Даніловіч; філаматы і філарэты, якія з'яўляліся таксама непасрэднымі ўдзельнікамі таго ці іншага працэсу ў кніжнай справе. Дзякуючы многім з іх з'яўляюцца новыя віды выданняў, пашыраецца рэпертуар свецкай, навуковай кнігі, кніжная спадчына вывучаецца ў кантэксце гісторыі краю, яго кніжных традыцый, у асвеце народа кніга набывае важнейшае значэнне. На персанальным узроўні ў эпоху Асветніцтва пашыраюцца міжнародныя кніжныя сувязі і кантакты, узаемаўплывы, што пацвярджаюць вынікі дзейнасці шэрагу ўраджэнцаў Беларусі, якія праявілі сябе ў сферы кніжнай справы, і іншых народаў.

Нельга не ўзгадаць, да прыкладу, Ілью Капіевіча (Ілья Фёдаравіч Капіеўскі)[6]. «Именно И. Ф. Копиевский, учитывая европейский опыт, издал на латинском и русском языках первые варианты печатных библиографических пособий. С учетом того, что за рубежом печатались только светские гражданские книги, можно считать И. Ф. Копиевского зачинателем гражданской библиографии в России»[7], а таксама і пачынальнікам грамадзянскага друку. Новы грамадзянскі шрыфт называўся першапачаткова амстэрдамскім, капіеўскім, беларускім.

Увогуле можна сказаць, што духоўнае жыццё, кніжныя веды Беларусі ў XVI–XVIII стст. развіваліся ў рэчышчы гуманістычнай спадчыны Ф. Скарыны, што засноўвалася на самакаштоўнасці асобы і грамадзяніна, кампрамісна існуючы ў полікультурнай супольнасці, распаўсюджваючы і памнажаючы еўрапейскі вопыт, захоўваючы ўласныя традыцыі.

Багатая кніжная спадчына, разнастайнасць навуковых прац стварылі неабходныя передумовы ў пачатку XIX ст. для ўсведамлення ролі кнігі ў жыцці грамадства, фарміраванні падстаў новай навукі, навукі пра кнігу ў інтэлектуальным цэнтры Літвы і Беларусі – Віленскім універсітэце. Вялікі ўплыў на ідэйную атмасферу ва ўніверсітэце меў гісторык *Іаахім Лялевель* [16]. Яго працы, напісаныя ў эпоху змен сацыяльных і палітычных ідэй,

---

[6] Скончыў Слуцкую пратэстанцкую гімназію, валодаў некалькімі замежнымі мовамі, прымаў удзел у распрацоўцы грамадзянскага шрыфту ў пятроўскай Расіі (выкарыстоўваючы для асновы шрыфт Ф. Скарыны). Перакладчык і выдавец ранніх рускамоўных навуковых прац у Амстэрдаме (з 1699 г. па 1706 г.). Склаў першыя ўлікова-рэгістрацыйныя ці выдавецкія формы бібліяграфічных дапаможнікаў (рэестраў) у Расіі (прадставіў Пятру I тры рэестры выданняў на рускай і лацінскай мове). У 1710 г. у дадатку да газеты «Ведомости» (№ 12) праца І. Капіевіча «Реестр книгам гражданским, которые по указу царского величества напечатаны новоизобретенною амстердамскою азбукою по первое число июня нынешнего 1710-го году» была надрукавана.

[7] *Гречихин А. А.* Общая библиография [Электронный ресурс] : учебник для вузов. М., 2000. Гл. 6. Развитие русской библиографии в XVIII в. (6.1. Первые русские печатные библиографические пособия). Режим доступа: www.hi-edu.ru/e-books/cb/index.htm ; гл. таксама: *Адарюков В. Я.* Книга гражданской печати в XVIII веке // Книга в России. М., 1924. Т. 1. С. 127–288; *Nowak Z.* Kopijewicz Eliasz // Słownik pracowników książki polskiej. Warszawa ; Łódź, 1972. S. 437; *Бярозкіна Н. Ю.* Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.). 2-е выд. Мінск, 2000. С. 76.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскай ментальнасці, сведчылі аб фарміраванні цікавасці да гісторыі кнігі, а таксама і аб развіцці навукі пра кнігу, якая называлася бібліяграфіяй, аб неабходнасці гістарыяграфічных і тэарэтычных абагульненняў у дадзенай галіне. У працы «Што такое бібліяграфія?» («Co jest bibliografia?», 1826) [26] І. Лялевель выдзеліў, як і заходнія тэарэтыкі кнігі таго часу М. Дэніс, Э. Г. Пеньё, навуку пра друкаваную кнігу («тыпаграфію»), навуку пра рукапісы («графіку»), навуку пра бібліятэчную кнігу («бібліятэчную справу»). У «Гісторыі Літвы і Русі аж да Люблінскай уніі з Польшчай 1569 г.» («Dzieje Litwy i Rusi aż do unii z Polską w Lublinie», 1839) ён пісаў пра ўсходнеславянскую культуру, значэнне «статутнай» мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім і дзейнасці Францыска Скарыны, Мамонічаў, Заблудаўскай друкарні.

Паслядоўнікам І. Лялевеля з'яўляўся і ўраджэнец Беларусі *Аляксандр Віктар Багаткевіч*, які дзякуючы працы «Аб усеагульнай бібліяграфіі» («Rzecz o Bibliografii powszechney») [28] вядомы як адзін з першых польскіх [24], літоўскіх [22] і беларускіх [8] бібліяграфазнаўцаў і кнігазнаўцаў. Бібліяграфія, згодна з яго тэорыяй, – навука пра кнігу: галіна тэарэтычнага, гістарычнага і практычнага апісання кніг, кніжных збораў, помнікаў пісьменства. Эпіграфам да работы А. Багаткевіч абраў шматзначны выраз на грэчаскай (!) мове – «Γράμματα μαθεῖν δεῖ καί μαθόντα νοῦν ἔχειν» («Літарам навучыцца трэба, а навучыўшыся, розум мець» (пер. – *Л.Д.*)). Айчынным кнігазнаўчым вопытам А. Багаткевіч лічыў польскі, адначасова вялікую ўвагу адводзіў непасрэдна работам па бібліяграфічным апісанні і вывучэнні кніжнай спадчыны ў розных краінах Еўропы; разглядаючы расійскія працы, адзначаў іх як агульныя крыніцы па гісторыі славянскага пісьменства і друкарскай справы, асабліва выдзяляў ролю Віленскага ўніверсітэта і «krajowców» у захаванні рэгіянальнай кніжнай спадчыны. Цікавая яго заўвага наступнага зместу: «Не адно вучонае пяро з годнай дакладнасцю рассейвае па зямлі Літоўскай і Польскай бібліяграфічныя звесткі, не адна рука знаўцы, перакладаючы, адшуквае і, узважваючы працы праслаўленых у навуцы мужоў, сплятае пышны вянок для выхаванцаў славянскіх муз; ці таксама пакалечаныя хваробай часу астанкі слядоў пісьмовых прац продкаў са страчаных дабывае, распазнае, параўноўвае, тлумачыць» [28, с. 64] (пер. – *Л. Д.*).

У першай палове XIX ст. былі зроблены спробы стварэння нацыянальнага рэпертуару кніг і перыядычных выданняў Беларусі ад пачатку кнігадрукавання і да 1847 г. Міхалам Пелка-Паліньскім [13], а таксама навуковай працы «Гісторыя славянскіх друкарняў у Літве» беларускім скарыназнаўцам прафесарам Міхаілам Бабroўскім [11, с. 20]. Першая праца засталася ў рукапісным выглядзе[8], другая – страчана.

І толькі ў канцы XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца работы, якія ўказваюць на прыналежнасць іх зместу да Беларусі, хоць яны таксама ўяўлялі этапныя даследаванні на шляху да стварэння ўласна беларускай навукі пра кнігу. Першая праца – «Беларуская літаратура і бібліяграфія» *Аляксандра Ельскага* – з'яўлялася аглядам публікацый з 1517 г. па 1892 г. і была

[8] Захоўваецца ў Бібліятэцы імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

надрукавана як энцыклапедычны артыкул [23]. З перапіскі А. Ельскага з польскім лінгвістам і этнографам Янам Карловічам вядома таксама, што ён «планаваў выдаць "Беларускую бібліяграфію" асобнай кнігай, аднак гэта задумка засталася неажыццёўленай» [14]. Другая праца – «Белорусы» *Яфіма Карскага* (т.1–3, 1903–1922 гг.) – стала крыніцай інфармацыі аб выданнях на беларускай мове, якія выйшлі на тэрыторыі Беларусі, а таксама па беларусазнаўстве. Сабраўшы і даследаваўшы вялікі масіў інфармацыі, Я. Карскі зрабіў і шэраг прапаноў па выяўленні, сістэматызацыі і распрацоўцы прынцыпаў ідэнтыфікацыі помнікаў беларускага пісьменства і друку, тым самым паказаў прыклад культуры навуковай кнігі, арганізацыі яе змястоўнага і даведачна-бібліяграфічнага кантэнту [15]. Абодва аўтары абапіраліся ў сваіх працах на бібліяграфію і славеснасць (літаратуру і мову), што паказвала на прыхільнасць вучоных да тэарэтычных палажэнняў (у тым ліку А. В. Багаткевіча), цесную ўзаемасувязь бібліяграфіі з гісторыяй славеснасці.

Такім чынам, першапачатковыя «эскізы» беларускага кнігазнаўства паказваюць нам яго збіральны вобраз, які складаецца з навуковых галін бібліяграфіі, гісторыі і філалогіі, а таксама даследчыкаў, вынікі персаніфікаваных ведаў якіх належаць сёння не толькі розным навукам, але і розным народам (палякам, рускім, літоўцам і беларусам).

Фенаменальнай падзеяй у кніжнай культуры Беларусі не толькі для свайго, але і для нашага часу з'яўляецца капітальная праца В. Ластоўскага «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя» (Коўна, 1926), падобнай якой на той час не мелі ні рускія, ні ўкраінцы, ні літоўцы [21]. Фенаменальнай з'яўляецца і асоба *Вацлава Ластоўскага*, якому ўдалося здзейсніць свайго роду подзвіг (кнігазнаўчы, навуковы, нацыянальны!), параўнальны хіба што з пачаткам беларускага кнігадрукавання і асобай Францыска Скарыны. Цікава, што асноўная дзейнасць і першага і другога звязана з Вільняй, асоба кожнага з іх станавілася на розных этапах гісторыі Беларусі сімвалам нацыянальнага адраджэння [6].

«Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» В. Ластоўскага стала першым вопытам цэласнага падыходу да гісторыі беларускай кнігі ў адзінстве яе матэрыяльнага, духоўнага і мастацкага пачаткаў[9].

Сярод апошніх кнігазнаўчых прац В. Ластоўскага, што адносяцца да перыяду яго высылкі ў Саратаў[10], – праграма лекцый па курсе «История книги»[11]. Захаваўся рукапіс праграмы, які датуецца 24.09.1936 [9]. Гэта

---

[9] Гл. таксама: *Шлюбскі А*. Рэцэнзія // Маладняк. 1926. № 5. С. 104–105 ; *Шлюбскі А*. Рэцэнзія // Полымя. 1926. № 5. С. 144–147.

[10] Матэрыялы пра дзейнасць В. Ластоўскага ў аддзеле рэдкіх кніг бібліятэкі Саратаўскага ўніверсітэта (1931–1937), заснаваныя на архіўных дакументах, надрукаваны ў зборніку навуковых прац «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Мінск, 2011. [Вып. 3]).

[11] История книги. Саратов, 1936. 2 с. Гл.: *Зюзин А. В.* Из материалов В. У. Ластовского // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац / склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. Мінск, 2011. [Вып. 3]. С. 171.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэматычны спіс дзесяці лекцый, кожная з якіх мае пэўнае кола пытанняў ці тэматычных кірункаў. В. Ластоўскі пачынае свае лекцыі з выкладання поглядаў на пісьмо як на Боскае «откровение», а заканчвае развагі пра тое, што «кніга не матэрыяльны прадмет, а зброя палітычнай барацьбы», падае «перыядызацыю кніг па сацыялагічным прынцыпе», завяршаецца цыкл лекцый пытаннем пра «заданне і ролю бібліятэкара ў эпоху дыктатуры пралетарыяту». Тэзісныя палажэнні праграмы, як можна меркаваць, хоць і скупа, але ўсё ж адлюстроўваюць канцэптуальны падыход В. Ластоўскага да вывучэння кнігі, якую, на яго погляд, неабходна аналізаваць як гістарычную з'яву на фоне агульначалавечага развіцця [9, с. 197]; пацвярджаюць разуменне і глыбокую ўпэўненасць Ластоўскага-кнігазнаўцы ў каштоўнасным значэнні кнігі для кожнага народа, а значыць, і для ўсяго чалавецтва.

В. Ластоўскі спадзяваўся, што яго праца «… прынясе карысьць нашай адраджаючай пісьменнасьці, хоць бы пабуджаючы другіх да працавітых досьледаў на полі нашай мінуўшчыны, асабліва пісьменнасьці…» [12, с. VIII]. Аднак пасля кнігазнаўчага ўсплёску 1920-х гг. прайшло яшчэ не адно дзесяцігоддзе, перш чым з'явіліся прадаўжальнікі і паслядоўнікі справы В. Ластоўскага, а яго галоўная праца «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» была перавыдадзена[12].

Першыя зрухі на этапе развіцця беларускага (савецкага) кнігазнаўства намеціліся з другой паловы 1950-х гг., калі даследаванне асобных пытанняў па гісторыі кнігі паступова стала вяртацца ў агульную праблематыку гуманітарных навук – філалогіі, гісторыі, філасофіі, мастацтвазнаўства, культуралогіі. Зноў была актуалізавана і стала вядучай скарыназнаўчая тэма[13], прадоўжылася навукова-бібліяграфічная праца па вывучэнні кірылаўскага друку[14], з'явіўся першы спецыяльны навуковы зборнік «Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии» (1970)[15], менавіта літаратуразнаўцамі ажыццёўлены першыя публікацыі першакрыніц па гісторыі кнігі[16] і першыя ў Беларусі энцыклапедычныя артыкулы, прысвечаныя кнігазнаўству [1]. Сярод падзвіжнікаў беларускага кнігазнаўства – С. Х. Александровіч, М. Б. Бацвіннік, Г. Я. Галенчанка, А. П. Грыцкевіч, В. І. Дарашкевіч, А. І. Жураўскі, Г. В. Кісялёў, А. Ф. Коршунаў, А. І. Мальдзіс, У. І. Мархель, В. А. Чамярыцкі, В. Ф. Шматаў і інш. У бібліятэчным асяроддзі таксама з'яўляюцца даследчыкі, якія займаюцца гіс-

---

[12] *Ластоўскі В.* Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі : факсімільнае выданне / прадм. А. Сушы. Мінск, 2012. 814 с.

[13] 450 год беларускага кнігадрукавання. Мінск, 1968 ; *Журавский А. И., Булыко А. Н.* 450 лет белорусского книгопечатания // Книга. Исследования и материалы. М., 1967. Сб. 14. С. 105 ; Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве / ред. А. Сидоров. М., 1979. 279 с. : ил.

[14] *Голенченко Г. Я.* Библиографический список белорусских старопечатных изданий XVI–XVIII вв. Минск, 1961. 127 с. ; *Сокольчик А. А.* Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768–1917). Минск, 1976. 426 с.

[15] Выдаваўся Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Я. Коласа НАН Беларусі.

[16] Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / склад. А. Ф. Коршунаў. Мінск, 1959. 471 с. ; Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / уклад.: Г. В. Кісялёў [і інш.]. Мінск, 1977. 544 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

торыяй кнігі і кніжных збораў. Гэта Ніна Ватацы, Лідзія Збралевіч, Людміла Навіцкая, Яўгенія Умецкая, Валянціна Цыбуля, Таццяна Рошчына і інш.

Варта разгляду асоба *Мікалая Сікорскага*, беларуса па паходжанні (нар. у Чэрвеньскім раёне, 1921–1997), кнігазнаўцы, доктара філалагічных навук, які скончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут (1948), застаўся працаваць у Маскве. Быў загадчыкам кафедры кнігазнаўства і рэдагавання МПІ (1954–1972), у 1972–1979 гг. – дырэктар ДБЛ СССР імя У. І. Леніна, галоўны рэдактар зборніка «Книга. Исследования и материалы» (1959–1992), галоўны рэдактар энцыклапедычнага слоўніка «Книговедение» (1981), рэалізацыі задумкі якога дамагаўся з пачатку 1970-х гг. М. Сікорскі быў адным з ініцыятараў правядзення ўсесаюзных навуковых канферэнцый па праблемах кнігазнаўства (з 1971); узнаўлення «Фёдоровских чтений» (1973); стварэння Усесаюзнага добраахвотнага таварыства аматараў кнігі (1974) [20].

Менавіта беларус М. Сікорскі зрабіў значны персанальны ўклад у развіццё савецкага кнігазнаўства, усведамленне нанова ролі і статусу кнігазнаўства, адраджэння яго як навукі. У гонар М. М. Сікорскага з 2008 г. Навуковым цэнтрам даследаванняў гісторыі кніжнай культуры Расійскай акадэміі навук праводзяцца «Чтения им. Н. М. Сикорского»[17].

У Беларусі дзейнасць вядомых асветнікаў і кніжнікаў мінулага вывучалася ў асноўным у межах гісторыка-філалагічных і гісторыка-філасофскіх навук, дзе біяграфіка і працы той ці іншай персоны з'ўляліся неабходным звяном, асновай для пабудовы і развіцця названых навук. Пэўнай з'явай у беларускім кнігазнаўстве стаў зварот да стварэння персанальнай бібліяграфіі, прысвечанай буйнейшым кнігазнаўцам свету[18].

Аднак аж да сярэдзіны 1990-х гг. кнігазнаўчая тэматыка ў Беларусі не з'яўлялася асобным і самастойным прэцэдэнтам для арганізацыі і правядзення якіх-небудзь навуковых канферэнцый[19], а толькі ўключалася ў агульную гуманітарную канву, у тым ліку, напрыклад, «Скарынаўскіх чытанняў» (з 1986 г.) ці іншых канферэнцый (напрыклад, прысвечаных В. Ластоўскаму, – першая праведзена ў 1993 г. у Наваполацку)[20]. Сёння

[17] Гл., напрыклад: *Бакун Д. Н.* Н. М. Сикорский и развитие науки о книге. М., 2008. 28 с. (Первые Чтения имени Н. М. Сикорского) ; *Немировский Е. Л.* Николай Михайлович Сикорский – книговед и историк книги. М., 2008. 48 с. (Первые Чтения имени Н. М. Сикорского) ; *Васильев В. И.* Н. М. Сикорский – Книга – Книжная культура (теоретико-методологические аспекты). М., 2008. 28 с. (Первые Чтения имени Н. М. Сикорского) и др.

[18] Профессор Кшиштоф Мигонь : библиогр. указатель / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина ; сост.: Ю. А. Лабынцев, Т. И. Рощина ; предисл. В. А. Петрицкого. Минск, 1990. 48 с. (Крупнейшие книговеды мира : сер. библиогр. указателей.)

[19] Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 3–4 кастр. 1996 г.) / Беларус. ун-т культуры. Мінск, 1997. 70 с.

[20] Матэрыялы Міжнар. навук. канф. «Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння», прысвечанай 110-й гадавіне з дня нараджэння вучонага, пісьменніка і грамадскага дзеяча (Наваполацк, кастрычнік 1993 г.) // Беларусіка=Albaruthenica / рэд.: В. Рагойша, Г. Цыхун, З. Шыбека. Мінск, 1995. Кн. 4. С. 236–356.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сярод асноўных сістэматычных кнігазнаўчых навуковых мерапрыемстваў можна назваць Кнігазнаўчыя чытанні (праводзяцца НББ з 1998 г.), Ельскія чытанні праводзяцца (БДУКМ, Музей «Дудуткі» з 1999 г.), Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні (праводзяцца БДУКМ з 1997 г.) і Беркаўскія чытанні (праводзяцца ЦНБ НАНБ з 2011 г.).

Спроба гістарыяграфічнага аналізу беларускай навукі пра кнігу ўпершыню была зроблена В. М. Герасімавым у энцыклапедычным артыкуле «Кнігазнаўства»[21], у якім комплексна разгледжаны пытанні станаўлення і развіцця беларускага кнігазнаўства ў сувязі з пэўнымі этапамі развіцця пісьменства і друку, навукі пра кнігу. У гісторыю беларускага кнігазнаўства былі ўведзены новыя імёны. Дасягненні, праблемы і перспектывы развіцця беларускай навукі пра кнігу разглядалі таксама М. В. Нікалаеў, Т. А. Самайлюк, Л. І. Доўнар. У 2008 г. быў выдадзены чарговы выпуск зборніка навуковых артыкулаў «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» [2], спецыяльна прысвечаны аналізу вопыту кнігазнаўчых даследаванняў у такіх цэнтрах, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі, Нацыянальная кніжная палата Беларусі.

Асаблівай увагі заслугоўваюць усе чатыры выпускі зборніка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» (2006, 2008, 2011, 2012 гг.), матэрыялы якіх сведчаць аб паступальным развіцці ў Беларусі як гістарычнага, так і тэарэтычнага кірункаў у кнігазнаўстве, дзе дамінуючай парадыгмай выступае нацыянальная кніжная культура, як у кантэксце міжнародных і міждысцыплінарных узаемасувязей, так і ў прыватных пытаннях (у тым ліку персанальнага кнігазнаўства[22]).

Неабходна адзначыць і значную ролю ў развіцці беларускага кнігазнаўства (у тым ліку і персанальнага) міжнародных сувязей і персанальных кантактаў: у галіне вывучэння кніжнай спадчыны, удзелу ў міжнародных праектах і канферэнцыях, публікацыі навуковых работ. Важнейшае значэнне мае ў дадзеным кірунку і пераклад на беларускую мову навуковых кнігазнаўчых тэкстаў, што ўзбагачае тэрміналагічны і змястоўны кантэнт

[21] *Герасімаў В. М.* Кнігазнаўства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1997. Т. 4. С. 213–214 ; таксама: Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 1999. Т. 8. С. 361–362.

[22] Гл., напрыклад, рубрыку «Personalia»: Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац. [Вып. 3] / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2011. С. 323–325.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай навукі пра кнігу[23]. У сваю чаргу пра сучаснае беларускае кнігазнаўства, кірункі яго развіцця (агульныя і асаблівыя) у кантэксце даследаванняў кніжнай культуры пішуць расійскія і польскія вучоныя[24].

Сінкрэтычнасць і кампаратыўнасць беларускай навукі пра кнігу выяўляецца як у яе падачы айчыннымі і замежнымі кнігазнаўцамі, даследчыкамі (даследаваннямі), так і шырокім колам вучоных гуманітарных навук (філалогіі, гісторыі, філасофіі, культуралогіі, мастацтвазнаўства) і іх распрацоўкамі.

Навука (навука пра кнігу асабліва, як і сама кніга!) – вынік калектыўнай працы, аднак статус навукі ў значнай ступені вызначае статус персанальны, гэта значыць навуковы аўтарытэт той ці іншай персоны.

Развіццё навукі ажыццяўляецца дзякуючы не толькі і не столькі суме назапашаных ведаў, а выключна дзякуючы з'яўленню фундаментальных праграмных прац, якія вызначаюць рух навукі, яе алгарытм на перспектыву.

1. *Александровіч, С. Х.* Кнігазнаўства / С. Х. Александровіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск : БелСЭ, 1972. – Т. 6. – С. 39.

2. Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк, Т. А. Дзем'яновіч ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – Вып. 2. – 219 с.

3. *Валевский, А. Л.* Основания биографики / А. Л. Валевский. – Киев : Наукова думка, 1993. – 110 с.

4. *Васильев, В.* Биографика деятелей книжной культуры России (проект Научного центра исследований истории книжной культуры РАН) / В. Васильев, М. Ермолаева // Бібліотечний вісник. – 2012. – № 1. – С. 43–47.

[23] Больш падрабязна, напрыклад, гл.: *Довнар Л. И.* Персоносфера как перспектива историко-книговедческих исследований // Берковские чтения – 2013. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 16–17 мая 2013 г.). Минск ; М., 2013. С. 121–125 ; *Довнар Л.* До и после Вацлава Ластовского: белорусская наука о книге в контексте персонального книговедения // Knygotyra. Vilnius, 2013. Т. 60. С. 170–191 ; *Довнар Л. И.* О роли личности в развитии науки о книге, или Штудии Кшиштофа Мигоня // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 25–26 мая 2011 г.). Минск ; М., 2011. С. 124–128 ; *Доўнар Л. І.* Кшыштаф Мігань і Беларусь // Кшыштаф Мігань = Krzysztof Migoń : біябібліягр. паказальнік (1960–2010): да 70-годдзя з дня нараджэння і 50-годдзя навук. дзейнасці / склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. Мінск, 2011. С. 39–46 ; *Довнар Л. И.* Возникновение и развитие науки о книге в Беларуси: истоки и перспективы во взаимосвязи // Фёдоровские чтения, 2012 / Науч. совет РАН «История мировой культуры» ; Отд. истор.-фил. наук РАН ; НЦ исслед. истории книжной культуры ; сост.: М. А. Ермолаева, Д. Н. Бакун ; отв. ред. В. И. Васильев. М., 2012. С. 250–265 ; *Доўнар Л. І.* Гісторыя беларускай кнігі : вучэб. дапам. / Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. Мінск, 2012. С. 16–17.

[24] Гл., напрыклад: *Ленский Б. В., Васильев В. И.* Книговедение. Книжная культура. Книгоиздание: история и современность. М., 2009. С. 16, 20–22, 27–29; *Migoń K.* 'Kultura książki' – wyrażenie potoczne, kategoria badawcza, czy specjalność naukowa? // Ludzie i książki. Studia i szkice bibliologiczno-biograficzne. Księga pamiątkowa dedykowana profesor Hannie Tadeusiewicz. Łódź, 2011. S. 55.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Диаковская, Е. А.* Эволюция персонально-ориентированных элементов справочно-поискового аппарата современных библиотек : дис. ... канд. пед. наук : 05.25.03 / Е. А. Диаковская. – Самара, 2004. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/evolyutsiya-personalno-orientirovannykh-elementov-spravochno-poiskovogo-apparata-sovremennyk. – Дата доступа: 14.09.2012.

6. *Довнар, Л.* Белорусское книговедение и национальное возрождение 1920-х годов / Л. Довнар // Knygotyra. – 2007. – T. 48. – S. 53–66.

7. *Довнар, Л. И.* Книговедческое знание и белорусская библиография: источники и ориентиры / Л. И. Довнар // Труды Междунар. библиографического конгресса, Санкт-Петербург, 21–23 сент. 2010 г. : [в 3 ч.]. – СПб. : Рос. нац. б-ка, 2012. – Ч. 3. – С. 238–248.

8. *Доўнар, Л. І.* Гісторыя беларускай кнігі : вучэб. дапам. / Л. І. Доўнар / Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2012. – 252 с.

9. Из бумаг В. У. Ластовского / подготовка и публикация текста Н. А. Попковой // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац / склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – [Вып. 3]. – С. 196–198.

10. *Кароткі, У. Г.* Тыпалогія прадмоў і пасляслоўяў беларускіх паслядоўнікаў Скарыны / У. Г. Кароткі // Спадчына Скарыны : зб. матэрыялаў Першых Скарынаўскіх чытанняў (1986) / уклад. А. І. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – С. 231.

11. *Лабынцаў, Ю.* Пачатае Скарынам. Беларуская друкаваная літаратура эпохі Рэнесансу / Ю. Лабынцаў ; пер. з рускамоўн. арыг. С. Шупы. – Мінск : Мастац. літ., 1990. – 333 с.

12. *Ластоўскі, В.* Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя / апр. В. Ластоўскі. – Коўна : Друкарня Сакалоўскага і Лана, 1926. – VIII, 776 с.

13. *Леончиков, В. Е.* Общая ретроспективная библиография книг союзных республик / В. Е. Леончиков // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. – Минск : Нар. асвета, 1972. – Вып. 1. – С. 3–5.

14. *Лявончыкаў, В. Е.* Бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць Аляксандра Ельскага / В. Е. Лявончыкаў // Бібліятэчны свет. – 2001. – № 2. – С. 25.

15. *Лявончыкаў, В. Е.* Кніжная культура ў навуковых працах акадэміка Я. Ф. Карскага / В. Е. Лявончыкаў // Духоўныя асновы сучаснай культуры: праблемы захавання культурнай спадчыны : XVI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 26–28 мая 2010 г. : у 2 т. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – Т. 1. – С. 144.

16. Лялевель (Lelewel) Іаахім / Дзмітрый Караў, Васіль Семенякоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 423–424.

17. *Мігань, К.* Стан сучаснага кнігазнаўства як навукі / К. Мігань ; пер. з пол. Ларысы Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк, Т. А. Дзем’яновіч ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – Вып. 2. – С. 10–38.

*18. Петрина, А. Б.* Научная биография в российской культурной и интеллектуальной традиции: поиск новой модели : дис. ... канд. ист. наук : 24.00.01 / А. Б. Петрина. – Омск, 2009. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/nauchnaya-biografiya-v-rossiiskoi-kulturnoi-i-intellektualnoi-traditsii-poisk-novoi-modeli#ixzz2Hafoo6xM. – Дата доступа: 14.09.2012.

*19. Сагановіч, Г.* Жалуды гісторыі / Г. Сагановіч // Наша Ніва. – 1998. – № 1 (98). – Рэжым доступу: http://nn.by/?c=ar&i=92879. – Дата доступу: 12.01.2013.

20. Сикорский Николай Михайлович // Книговедение : энцикл. слов. – М. : Сов. энцикл., 1982. – С. 483.

*21. Суша, А.* Першая гісторыя беларускай кнігі і яе стварэнне / А. Суша // Ластоўскі, В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі : факсімільнае выданне. – Мінск : Мастац. літ., 2012. – С. 3–29.

22. Теоретик науки о книге Александр Виктор Богаткевич и его Труд о всеобщей библиографии // Veikalas apie visuotinę bibliografiją / Aleksandras Wiktoras Bohatkiewiczius ; parengė A. Braziūnienė, A. Navickienė. S. Rankelienė. – Vilnius, 2004. – S. 253.

23. Białoruska literatura i bibliografia / [Aleksander Jelski] // Wielka encyklopedia powszechna ilustrowana. – Warszawa, 1892. – T. 8. – S. 646–658.

*24. Kłossowska, M.* Aleksander Wiktor Bohatkiewicz / M. Kłossowska // Studia o Książce. – 1971. – T. 2. – S. 221–239.

*25. Koredczuk, B.* Biografia jako kategoria badawcza w polskiej bibliologii / B. Koredczuk // Bibliologia. Problemy badawcze nauk humanistycznych : praca zbiorowa pod redakcją Dariusz Kuźminy. – Warszawa : Wydawnictwo SBP, 2007. – S. 60–70.

*26. Lelewel, J.* Bibliograficznych Ksiąg Dwoje, w których rozebrane i pomnozone zostały dwa dzieła Jerzego Samuela Bandtke / J. Lelewel. – Wilno, 1823–1826 (Nakł. J. Zawadzkiego). – T. 1–2.

27. Migoń, K. [Recenzja] / Krzysztof Migoń // Roczniki Biblioteczne. – Wrocław, 2001. – R. 45. – S. 273–275. – Rec. na ksiaż.: Schreiber Klaus : Biografische Informationsmittel.Tipologie mit Beispielen / Klaus Schreiber. – Berlin : Deutsches Bibliotheksinstitut, 1999. – Teibd. 1–2. – 1252 s. – (Informationsmittel für Bibliotheken (IFB) ; beiheft 9).

28. Rzecz o Bibliografii powszechney na otworzenie tego kursu w Cesarskim Uniwersytecie Wileńskim dnia 10. Stycznia 1829. roku napisana przez Alexsandra Bohatkiewicza. – W Wilnie nakładem i drukiem A. Marcinowskiego, 1830. – 74 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*L. DOUNAR*

## THE BELARUSIAN BIBLIOLOGY IN THE PERSONAL BIBLIOLOGY CONTEXT

*The article deals with problems of origin and development of the Belarusian book science in the context of a personal bibliology. The material in the article has a theoretical and methodological nature, which explains the nature and the*

*meaning of «personal» in the book science, shows the role of various persons in the development of the Belarusian book science at different stages of history from the Middle Ages to the present day. The role of international relations and personal contacts in the development of the Belarusian book science (including personal bibliology) is emphasized: in the field of a book heritage exploration, participation in international projects and conferences, scientific articles' publication.*

*It is proved that the status of the book science, which is being the result of the teamwork, to a large extent determines the personal status, i.e. scientific authority of a person or persons; and the development of science is implemented not only due to the accumulated knowledge, but thanks to the appearance of fundamental program works determining the movement of science, its algorithm for the perspective.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 23.09.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ